## У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Міжнародны дзень роднай мовы прайшло мерапрыемства з удзелам прадстаўнікоў дыпламатычных місій



Фота Наталі КУПРЭВІЧ

нага музея гісторыі беларускай літаратуры.

✓ У Арт-гасцёўні «Высокае мѣста» **20 лютага** адкрытая **выстаўка жывапісу і арт-аб'ектаў «Много букв»** Ганны Сілівончык. Праект уключае больш за 70 працаў розных перыядаў. Ключавым элементам кампазіцыі і сэнсаўтварэння з'яўляецца тэкст. Аб'яднанне вобразаў і сэнсаў на карцінах Г. Сілівончык здзіўляе метафарычнасцю і нараджае нечаканыя асацыяцыі. Мастачка актыўна працуе і з аб'ёмнымі формамі, эксперыментуе з выяўленчымі сродкамі. Пабачыць усё можна па 15 сакавіка.

✓ **20 лютага** галерэя сучаснага мастацтва «Ў» сумесна з Амбасадай Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь запрасіла на **адкрыццё выстаўкі літоўскага мастака Альгіса Грышкявічуса «Паралельныя ўяўленні»**. Яна ўключае фатаграфічныя цыклы, калекцыю жывапісу і скульптурных аб'ектаў. Сам аўтар любіць казаць, што ён не фатограф, а проста з дапамогай фотаапарата стварае карціны.

**21 лютага** НББ правяла акцыю **«Мілагучнае, звонкае, спеўнае слова»**, прысвечаную да Міжнароднага дня роднай мовы. У гэты дзень на вонкавым электронным светлавым табло ўстановы можна было ўбачыць не толькі традыцыйныя цытаты класікаў нацыянальнай літаратуры пра беларускую мову, але і простыя беларускія словы, што адрозніваюць нас ад іншых народаў.

✓ **24 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылося мерапрыемства **«Святам свяцонае маміна слова»**, прымеркаванае да 85-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Імпрэза ладзілася сумесна з Клубам «Класікі і сучаснікі» Мінскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа імя М.С. Высоцкага, адбылася ў межах літаратурна-дакументальнай экспазіцыі «Валянцін Тарас і Рыгор Барадулін. На выспе ўспамінаў...». «Толькі родная мова можа даць крылы для творчага ўзлёту. Дзякуй роднаму беларускаму слову. Яно дало мне адчуць радасць сказаць нешта сваё. Нельга тымі словамі, якія пачуў ты ўпершыню ад маці, хлусіць Айчыне, Народу», – сцвярджаў народны паэт.

У мерапрыемстве бралі ўдзел скульптар, аўтар помніка Р. Барадуліну ва Ушачах і мемарыяльнай дошкі на доме ў Мінску, дзе жыў паэт, Ігар Засімовіч, паэт і сябра пісьменніка Ганад Чарказян, мастак і паэт Рыгор Сітніца. Падчас мерапрыемства бард Зміцер Бартосік выканаў песні на вершы Р. Барадуліна.





*На фота Наталі КУПРЭВІЧ: Ганад Чарказян і Сяргей Шапран*